*Фотафакт*

# КАРАЛІ ВУЛІЧНЫХ ПЛЯЦАЎ

**Нібы вулей вясной прачнуўся: некалькі дзён гудзеў Мінскі палац культуры і спорту чыгуначнікаў, дзе праходзіў рэспубліканскі чэмпіянат па вулічным танцы STREET CONNECT.**

Сюды з усёй Беларусі з'ехаліся крэатыўныя дзеці і моладзь, каму падабаюцца футболкі неабсяжных памераў, кіслотныя трэнікі, бейсболкі і ў тэму яркія красоўкі. Прыкід плюс талент — і ты герой, дакладней гераіня (у вулічных танцах у асноўным спаборнічалі калектывы, якія складаліся з дзяўчат) танцпляцоўкі! Show dance і Pop dance, Hip-hop і House, Choreo contest, Street performance і K-pop cover dance — у розных катэгорыях спаборнічалі ўдзельнікі чэмпіянату STREET CONNECT.




Адзіночкі танцавалі сола. І журы прыйшлося нялёгка, адсочваючы майстэрства камандных шоу-выступленняў. Гледачы падтрымлівалі сваіх фаварытаў, не шкадуючы галасавых звязак і апладысментаў. На дастойнае выкананне нават сапернікі рэагавалі пазітывам і падтрымкай. «Вулічнікі» — не мажоры папсовыя — справядлівыя! Да таго ж сябе паказаць ды на іншых паглядзець — заўжды ідзе ў залік творчага развіцця.

Абаяльная і таленавітая Аляксандра Антановіч усяго два гады (са сваіх 8) займаецца ў танцавальным калектыве No Flex з Гродна. Іх маладая кіраўніца — хвацкая танцоўшчыца трэнер Насця Фларыда — мнагаму навучыла Сашу і іншых сваіх вучаніц. Невыпадкова яны трапілі ў фінал, і танец гурта No Flex атрымаўся па выкананні і драматургіі сапраўдным міні-спектаклем. Ганаровае трэцяе месца — добрая адзнака для вядомага ў Гродне і за яго межамі No Flex Danze Center. Другое месца заняла школа танцаў з Магілева The Frndz за гарэзлівую пастаноўку «Ну, пачакай!». Юныя «Кухары» з Баранавіцкай Ananko dance school (недарэмна паўсюдна цягалі за сабой рэквізітныя, вялікіх памераў, сэндвічы і хот-догі) атрымалі першае месца — Гран-пры чэмпіянату па вулічных танцах STREET CONNECT.






**Тамара ХАМІЦЭВІЧ,**
**фота аўтара.**